УДК 373.31

# УПЛЫЎ ЗАГАДАК НА ФАРМІРАВАННЕ ВЫРАЗНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

**В. Я. Барысенка**
дацэнт, кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры спецыяльнай педагогікі і методык дашкольнай і пачатковай адукацыі,
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна
**В. А. Каваленка**
студентка чацвёртага курса факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі,
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна

*У артыкуле прасочваецца гісторыя стварэння, станаўлення і развіцця загадкі як жанру фальклору. Разглядаецца ўплыў загадак на станаўленне выразнага маўлення чалавека. Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся метады аналітычнага апісання, сістэматызацыі, абагульнення і разважання. Быў выкарыстаны матэрыял з педагагічнай пераддыпломнай практыкі, якая праходзіла на базе сярэдняй школы № 11 горада Мазыра. Пачынаючы з глыбокай даўніны і да сённяшняга часу загадка бытуе ў розных галінах чалавечай дзейнасці. Дэтальна распісана методыка працы з тэкставымі загадкамі і загадкамі-задачамі на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковых класах. Зроблены вывыд аб тым, што праца па фарміраванні навыкаў выразнага чытання не з'яўляецца закончанай і патрабуе далейшага працягу і развіцця. Неабходна ўжываць загадку для адпрацоўкі тэхнікі чытання і асноўных кампанентаў выразнага чытання.*

***Ключавыя словы:*** *фальклор, загадка-задача, абстрактныя паняцці, метафара, асацыяцыя, слоўнікавы запас, маўленчая дзейнасць, сэнс слова, лагічны націск, паўза.*

# THE INFLUENCE OF MYSTERIES ON THE FORMATION OF EXPRESSIVE READING IN PRIMARY SCHOOL

**V. Y. Borisenko**
Associate Professor, Candidate of Philological Sciences, Associate Professor of the Department of Special Pedagogy and Methods of Preschool and Primary Education
Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin, Mozyr, Republic of Belarus
**V. A. Kovalenko**
a fourth-year student
faculty of preschool and elementary education
Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin, Mozyr, Republic of Belarus

*The article traces the history of the creation, formation and development of the riddle as a genre of folklore. The influence of riddles on the formation of clear human speech is considered. Methods of analytical description, systematization, generalization and reasoning were used in writing the article. Material from pedagogical undergraduate practice, which took place on the basis of*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*secondary school № 11 in Mozyr, was used. From ancient times to the present day the riddle has existed in various fields of human activity. The methods of working with text riddles and riddles-tasks in reading lessons in primary school are described in detail. The result is that the work on the formation of clear reading skills is not complete and requires further continuation and development. It is necessary to apply the riddle to practice reading techniques and the main components of clear reading.*

***Key words:*** *folklore, riddle-task, abstract concepts, metaphor, association, vocabulary, speech activity, meaning of the word, logical stress, pause.*

**Уводзіны.** Сёння загадкі асацыіруюцца найперш з дзіцячым фальклорам, але так было не заўсёды. Узніклі яны яшчэ ў тыя часы, калі старажытны чалавек спасцігаў свет.

Этнограф XIX стагоддзя Дзмітрый Садоўнікаў пісаў, што іх гісторыя ўзыходзіць да глыбокай старажытнасці: «... да таго часу, калі чалавек глядзеў на прыроду як на нешта жывое, калі з'явы яе былі для яго пераважнай, страшэннай таямніцай» [1]. Вобразы ў іх адлюстроўвалі і тлумачылі свет прыроды.

Пазней загадкі сталі загадваць у асабліва важныя моманты жыцця: падчас вяселля, пахавання або калі рыхтаваліся да збору ўраджаю. Па павер'ях, правільны адказ дапамагаў выканаць жаданне або абараняў ад небяспекі. Калі ж адгадаць не атрымлівалася, услед чакала пакаранне, і вельмі жорсткае – аж да смерці. Гэта адгукнулася і ў фальклоры: у казках складанымі загадкамі-задачамі выпрабоўвалі героя. Напрыклад, такіх казках, як «Разумная дачка», «Ідзі туды – не ведаю куды, прынясі то – не ведаю што», «Крошачка-Хаўрошачка», «Фока – на ўсе рукі дока», «Царэўна-лягушка» і інш.). З часам загадкі гублялі сваё асаблівае значэнне. Іх сталі выкарыстоўваць для забавы і развіцця кемлівасці малых. Звычайна на вячорках старэйшыя паступова вучылі дзяцей разгадваць загадкі.

Як правіла, загадвалі канкрэтны прадмет, напрыклад, стол ці сякеру, часам дзеянне – *ворыва, будаўніцтва, збіральніцтва, ткацтва* і інш. І зусім рэдка абстрактныя паняцці: *час, мудрагелістасць, маладосць, праўда, розум*: "*Сутуленькі, / маленькі, / Гарбаценькі / Па полі свішча, / А дадому прыбяжыць – / Усю зіму праляжыць*" (Серп).

У аснове загадак, як правіла, ляжала апісанне знешняга выгляду і пэўнага дзеяння: «*Быў шар белы. Вецер падзьмуў, і шар паляцеў*» (Дзьмухавец).

Большая іх частка ўтворана з дапамогай старадаўніх метафар або асацыяцый, якія не заўсёды зразумелыя сучаснаму чалавеку. Таксама загадкі маглі будавацца на супастаўленні прадметаў або іншасказанні: «*Тонка дрэўца жываты пампуе*» (Калоссе); "*Ляціць птушка тонкая, / Пер'е чырвонае ды жоўтае, / Па канец ея – чалавечая смерць*" (Стрэльба).

У загадках часта выкарыстоўваліся вобразы, звязаныя з нябеснымі свяціламі: *сонца на ўзыходзе і заходзе, месяц, зоркі*. Збіральнік фальклору Аляксандр Афанасьеў пісаў: «... смелыя пытанні, зададзеныя дапытлівым розумам чалавека пра магутныя сілы прыроды, сказаліся менавіта ў гэтай форме» [2]. Даследчыкі мяркуюць, што загадкі пра свяцілы і з'явы прыроды – самыя старажытныя, у іх выяўляюцца атрыбуты паляўнічага і пастуховага побыту нашых продкаў.

Неба ў загадках паўставала бязмежнай прасторай, якую параўноўвалі з футрам або шатром і згадвалі як фон для свяцілаў. Таму звычайна параўноўвалі са срэбрам і золатам, з белымі гузікамі. Асабліва ў загадках адзначалася, што Месяц і Сонца ніколі не бываюць на небе разам: "*Залаты гаспадар – на поле; / Срэбраны пастух – з поля*".

Акрамя таго, што чалавек шмат назіраў за навакольным светам і прыродай, ён назіраў і за сваімі суседзямі. Адсюль і з'явіліся загадкі аб самім чалавеку, частках яго цела (вочы, нос, рукі), адзенне і г. д. Адна з самых вядомых загадак пра чалавека, знаёмая шматлікім народам свету, гучыць так: "*Раніцай – на чатырох нагах, / апоўдні – на двух, / вечарам – на трох*" (Дзяцінства, маладосць, старасць).

**Мэта і задачы.** Мэта артыкула – паказаць карыснасць выкарыстання народнага фальклору для развіцця слоўнікавага запасу і маўленчай дзейнасці малодшых школьнікаў. Вырашаліся наступныя задачы:
– закрануць крыніцы станаўлення і развіцця загадак;
– прасачыць умовы стварэння тэкстаў загадак;
– паказаць методыку працы з тэкставымі загадкамі і загадкамі-задачамі.

**Метады і матэрыял даследавання.** Былі выкарыстаны метады аналітычнага апісання, сістэматызацыі, абагульнення і разважання. Быў выкарыстаны матэрыял з педагагічнай пераддыпломнай практыкі, якая праходзіла на базе агульнаадукацыйнай школы № 11 горада Мазыра.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ва ўжытак чалавека пачалі ўваходзіць новыя прадметы і паняцці, з'яўляліся новыя загадкі, а фальклорныя тэксты аб састарэлых прадметах знікалі з актыўнага слоўніка.

Тым не менш, гэта не перашкодзіла загадкам застацца любімым дзіцячым жанрам. Яны аказвалі і аказваюць вялікі ўплыў на развіццё мыслення дзяцей. Больш за тое, яны ўсё часцей сталі выкарыстоўвацца на ўроках літаратурнага чытання і мовы, бо ўзбагачаюць слоўнік навучэнцаў за кошт шматзначнасці слоў, фарміруюць уяўленні аб пераносным значэнні слова, а таксама спрыяюць фарміраванню вобразнасці і выразнасці маўлення.

У цяперашні час не ўсе вучні валодаюць навыкамі выразнага чытання. Дадзеную праблему можна вырашыць пры дапамозе выкарыстання загадак на ўроках літаратурнага чытання і мовы. Але гэта атрымаецца толькі тады, калі праца ў класе будзе сістэматычнай і мэтанакіраванай [3].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Для таго, каб загадкі сталі эфектыўным сродкам фарміравання выразнага чытання неабходна выконваць працу па развіцці ўменняў кіраваць дыханнем, выбіраць патрэбную інтанацыю, неабходны тэмп маўлення, карыстацца лагічнымі паўзамі і націскамі.

Урокі літаратурнага чытання варта пачынаць з выканання практыкаванняў па тэхніцы прамовы. Сэнс і мэтазгоднасць дадзеных практыкаванняў заключаецца ў тым, каб правесці свайго роду дыхальную гімнастыку, падрыхтаваць маўленчы апарат да працы, наладзіць дзяцей на актыўную дзейнасць.

У якасці практыкаванняў выкарыстоўваецца харавое і індывідуальнае прагаворванне скарагаворак. На матэрыяле скарагаворак дзеці вучацца выразнасці і правільнасці вымаўлення.

Кожная скарагаворка вымаўляецца не менш чым з двума рознымі падтэкстамі (сэнсамі). Напрыклад: «*Піліп ды ліпы прыліп*». Яе можна вымавіць з такімі падтэкстамі:

1. Пашкадаваць Піліпа: «*Ах, як шкада, прыліп да ліпы*».

2. Папракнуць яго: «*Эх ты*!»

3. Выказаць здзіўленне: «*Як можна было прыліпнуць*?».

Дадзены тып працы ў нейкай меры падводзіць да тэмы ўрока. На выкананне практыкаванняў па тэхніцы прамовы адводзіцца на ўроку да 4–5 хвілін.

Асноўная частка заняткаў прысвечана працы над загадкамі. Праводзіцца гутарка з навучэнцамі, мэта якой заключаецца ў тым, каб дзеці ўспомнілі вядомыя ім загадкі.

Навучэнцы задаюць загадкі, могуць адразу ж даваць адгадкі. Можна зрабіць і так: адзін загадвае, астатнія адгадваюць. Настаўнік адзначае найбольш удалыя адказы, тлумачэнні, цікавыя загадкі. Пасля гэтага праводзіцца чытанне і разбор загадак.

Напрыклад: Прачытайце пра сябе загадку: “*Над бабулінай хаткай / вісіць хлеба акрайчык. / Сабакі на яго выюць, / а дастаць не могуць*”.

– Адгадайце загадку. Што гэта такое?

– Гэта месяц.

– З чым параўноўваецца месяц?

– З акрайчыкам хлеба.

– Чаму ён параўноўваецца менавіта з ім?

– Таму, што ён падобны на акрайчык хлеба.

– Што ў гэтым параўнанні ёсць незвычайнага?

– Акрайчык хлеба ляжыць на стале, а месяц вісіць у небе.

– Чаму сабакі выюць?

– Яны бачаць месяц, думаюць, што гэта акрайчык хлеба, і злуюцца, што не могуць дастаць (адзін з магчымых варыянтаў адказу).

Далей праводзіцца работа па славесным маляванні загадкі: *зорнае неба, залаты месяц, брэх сабак, вёска, цёмныя хаты са светлымі акенцамі, цёмны лес* і г. д. Дадзены від работы спрыяе як развіццю вобразнага і выразнага чытання ў далейшым, так і ўзбагачэнню слоўнікавага запасу школьнікаў і багацця іх вуснага маўлення.

Наступны этап – чытанне загадкі ўслых. Але перш, чым чытаць услых, варта знайсці ў ёй найбольш важныя па сэнсе словы (расставіць лагічныя націскі, паўзы). Пры чытанні іх трэба вылучаць голасам.

Тэкст загадкі запісваецца на дошцы. Вучні знаходзяць разам з настаўнікам лагічныя націскі, паўзы; потым робіцца лагічная разметка тэксту, лагічныя націскі падкрэсліваюцца гарызантальнай рысай, паўзы абазначаюцца вертыкальнымі рысамі.

*Над бабулінай хаткай | Вісіць хлеба акрайчык. || Сабакі на яго выюць, | А дастаць не могуць.*

Апошні этап – чытанне загадкі з рознымі падтэкстамі. Напрыклад:

1. Быццам вы, чытаючы загадку, самі сябе пытаеце: «Што ж гэта такое? Ніяк не магу здагадацца».

2. Вы ўжо ведаеце адгадку: гэта месяц – і любуецеся карцінай зорнай ночы ў вёсцы.

Настаўнік паказвае, як чытаецца загадка ў тым і ў другім выпадку. Затым гэтую загадку чытаюць самі вучні: спачатку самі сабе, потым – выбарачнае чытанне, як вынік працы – выразнае чытанне.

Асобна вылучаецца група загадак, у якіх прадметы апісваюцца з дапамогай гукапераймання. І загадкі гэтага тыпу таксама варта выкарыстоўваць для адпрацоўкі навыкаў выразнага чытання.

На гэта звяртала ўвагу М. А. Рыбнікава. Яна пісала: «Трэба прывучыць вучня не толькі бачыць карціны, якія малюе пісьменнік, але і чуць гучанне верша, яго інструментоўку, гукаперайманне і гукапіс» [4, с. 98]. Яна адзначала, што пры чытанні загадак неабходна, каб у дзіцячай гаворцы выразна адлюстроўвалася іх гукавая інструментоўка: «Калі загадка малюе карціну з дапамогай гуказапісу або гукапераймання, то настаўнік падкрэслівае сваім вымаўленнем гэты гукавы эфект і патрабуе ад вучняў такога ж свядомага і выразнага вымаўлення» [4, с. 101].

Навучыўшы дзяцей прайграваць гукапіс сродкамі вуснай мовы, настаўнік будзе развіваць гэтыя навыкі далей, у працы над мастацкімі тэкстамі, дзе сустракаюцца спецыяльныя гукападборы, гукаперайманні як элементы малюнка карціны, дзеяння і г. д.

Напрыклад, праца па загадцы такога тыпу вядзецца наступным чынам. Настаўнік выбірае вучня, які добра чытае, і просіць яго прачытаць загадку: “*Хто на вуліцы гуляе / Ад варот недалёка? / Лапкай зямлю раздзірае / І кудахча: «Ко-ко-ко»?*”.

МГПУ им. И.П.Шамякина

– Вы ўжо здагадаліся, хто гэта?

– Курыца.

– Як вы гэта вызначылі?

– Па апошнім радку. Толькі курыца выдае такія гукі.

Пасля гутаркі робіцца лагічны разбор, абазначаюцца лагічныя націскі, паўзы. Далей праводзіцца выразнае чытанне загадкі.

На наступных уроках вучні рыхтуюцца да выразнага чытання загадак, працуючы ў парах. Кожнай пары раздаюцца карткі з загадкамі, дзе яны робяць лагічную разметку тэксту, падкрэсліваюць лагічныя націскі, паўзы. Пасля разбору загадак дзеці самастойна тлумачаць іх і выразна чытаюць. Настаўнік адзначае найбольш удалае чытанне.

Праца па фарміраванні навыкаў выразнага чытання не з'яўляецца закончанай і патрабуе далейшага працягу і развіцця. Настаўнік, безумоўна, можа ўжываць загадку для адпрацоўкі тэхнікі чытання і асноўных кампанентаў выразнага чытання.

**Заключэнне.** Такім чынам, фарміраванне навыкаў выразнага чытання ў малодшых школьнікаў – вельмі важная частка працы настаўніка пачатковых класаў, бо менавіта ў пачатковай школе фарміруюцца першыя ўменні, звязаныя з выразным чытаннем.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Загадкі рускага народа : зб. загадак, пытанняў, прыпавесцяў і задач / уклад. Д. Садоўнікаў. – СПб. : тып. Н. А. Лебедзева, 1875. – [4], VI, [2], 332 с.

2. Рэжым доступу URL: Афанасьев Александр Николаевич – Поэтические воззрения славян на природу (Том 1). Читать книгу онлайн. Страница – 4 (unotices.com).

3. Грахова, С. І. Развіццё слоўнай творчасці малодшых школьнікаў на аснове фальклорных твораў / С. І. Грахова, О. А. Ціханава, З. Г. Шарафетдзінава // European Social Science Journal. – 2018. – № 3. – С. 245–250.

4. Рыбнікава, М. А. Нарысы па методыцы літаратурнага чытання / М. А. Рыбнікава. – М. : Навука і тэхніка, 1963. – 146 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина